**ГУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2016 г.

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу

**1 снежня**

У Кобрынскім дзяржаўным палітэхнічным каледжы адбылося пасяджэнне клуба «Час і ты» **«К свету из бездны»**, прымеркаванае да Сусветнага дня прафілактыкі Сніду. З вялікай увагай прысутныя слухалі аўдыязварот паміраючай ад Сніду дзяўчыны - «Запомніце мяне маладой». Доктар валеолаг Васільева С.С. расказала пра сітуацыю з захворваннем ВІЧ/Снідам у Беларусі, Брэсцкай вобласці, Кобрыне і Кобрынскім раёне. Удзельнікі пасяджэння прынялі актыўны ўдзел у віктарыне, пераможцы атрымалі прызы.

Цэнтральная бібліятэка, 30 чал.

**1 снежня**

Да Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу ў Батчанской публічнай бібліятэцы адбылося выступ ленне ЛПГ «Крыніца» з літаратурна-музычнай кампазіцыяй **«СНІД не спіць»**. Увазе маладых наведвальнікаў арганізавана выстава «Мы выбіраем жыццё». Бібліятэкарам дадзена інфармацыя пра агульныя аспекты захворвання, пра сітуацыю з ВІЧ/СНІДам у Кобрынскім раёне. Удзельнікі мерапрыемства склалі зварот да моладзі “Мы супраць шкодных прывычак”

Батчанская ПБ, 75 чал.

**1 снежня**

На гадзіне здароў'я **“Дурман – трава или обманутые судьбы”** для моладзі быў прадстаўлены відэаагляд літаратуры аб праблемах наркаманіі. Арганізавана дыскусія “Здаровым быць модна”.

Верхалеская ПБ, 21 чал.

**2 снежня**

На гадзіну шчырай размовы **«Паміж явай і сном, паміж пеклам і раем»** была запрошана фельчар Лукскай амбулаторыі Антончык Р.С., якая расказала аб сітуацыі па Кобрынскаму раёну і аб прафілактычных мерапрыемствах супраць СНІДу. Бібліятэкар прадэманстравала відэаролік на тэму здаровага ладу жыцця.

Лукская ПБ, 25 чал.

**2 снежня**

У глядзельнай зале Стрыгаўскага Цэнтра культуры і вольнага часу адбылося выступленне літаратурна-паэтычнай групы **«Скажы жыццю «Так!»**. Маладыя людзі прагледзелі відэастужку пра знакамітых людзей, якія загінулі ад Сніду; прынялі ўдзел у тэматычнай віктарыне. Увазе наведвальнікаў арганізавана кніжная выстава «Здаровае пакаленне – багацце краіны».

Стрыгаўская ПБ, 72 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках Года культуры**
**да 125-гооддзя з дня нарадж. М. Багдановіча**

**З 7 па 16 снежня 2016 г.**

На працягу двух тыдняў Кобрынская цэнтральная бібліятэка сумесна з кінатэатрам "Вясёлка" прымала ўдзел у рэспубліканскай акцыі "Чытаем Багдановіча разам". У рамках акцыі прайшлі гадзіны літаратурнага партрэта **"І свеціцца зорнае слова Максіма"**, выступленні літаратурна-паэтычннай групы **"У вянок паэту"**, конкурс чытальнікаў **"Паэтыка яго таленту"**, прагляд фільма **"Зорны шлях"**. У акцыі прынялі ўдзел вучні старэйшых класаў усіх школ горада.

ЦРБ, 750 чал.

**7 снежня**

На выступленні ЛПГ **"І зорка гарыць, і не вяне вянок…"** прысутныя пазнаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча, прагучалі яго вершы. У выкананні вучаніц 8 –га класа прагучаў раманс "Зорка Венера". Выступленне ЛПГ суправаджалася рэкламай твораў паэта з кніжнай выставы"Паэт красы, святла , любові"

Лукская ПБ, 22 чал.

**9 снежня**

У час літаратурна-музычнай кампазіцыі, прысвечаная125-годдзю М.Багдановіча **"Нязгаснаю зоркай ты ў небе Радзімы навекі**" прысутныя пазнаёміліся з біяграфіяй і творчасцю беларускага класіка, прагучалі яго вершы, рамансы. Выступленне суправаджалася прэзентацыяй "Паэт чыстае красы", рэкламай твораў з аднайменнай выставы. У канцы прысутныя выказалі сваё стаўленне да творчасці М. Багдановіча.

Залеская ПБ, 80 чал.

**11 снежня**

Літаратурная вечарына **"Незабыўны Максім Багдановіч"** праведзена да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Вядучыя мерапрыемства – вучні Балоцкай школы расказалі аб жыцці і творчай дзейнасці паэта. Чыталі вершы, урывак з паэмы "Мушка-зелянушка і Камарык- насаты тварык", слухалі песні: "Зорка Венера" , "Маладыя гады". Паглядзелі слайды "Жыцце і творчасць М.Багдановіча".

Балоцкая ПБ, 22 чал.

**13 снежня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры ЦБ адбылася літаратурная гасцёўня **«І плыве твой радок, і звініць тваё слова»**. На мерапрыемстве прысутнічалі навучэнцы СШ №3. Вядучыя расказалі пра жыццёвы і творчы шлях беларускага паэта, гаварылі аб незвычайным літаратурным таленце М. Багдановіча. Мерапрыемства ўключала ў сябе літаратурную віктарыну "А сэрца імкнецца да бацькавага краю" і літаратурна-музычную кампазіцыю "Святло паэзіі Максіма Багдановіча".

Цэнтральная бібліятэка, 32 чал.

## Іншыя мерапыемствы

**2 снежня**

У цэнтральнай бібліятэцы адбыўся Дзень творчага планавання **“Вучымся майсэрству планавання”**, на які былі запрошаны бібліятэчныя супрацоўнікі ўсіх структурных падраздзяленняў ГУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”. Адбылася прэзентацыя **“Календара памятных і юбілейных дат на 2017 год”**. Прадстаўлены план работы аддзела бібліятэчнага маркетынгу, вызначаны асноўныя напрамкі дзейнасці. Праведзена ярмарка самых яскравых мерапрыемстваў, запланаваных на 2017 год.

Цэнтральная бібліятэка, 52 чал.

**6 снежня**

Гадзіна даверу **«Слово звучит лишь в отзывчивом сердце»** прайшла пад лозунгам «Добро от чистого сердца». На мерапрыемства запрошаны падапечныя Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання дзённага знаходжання дзяцей - інвалідаў, а таксама састарэлыя і інваліды Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната. Супрацоўнікі бібліятэкі зрабілі атмасферу мерапрыемства радаснай і святочнай. У завяршэнні гасцям паказаны фрагмент мультфільма «Шрек-мороз, зеленый нос».

Цэнтральная бібліятэка, 34 чал.

**24 снежня**

Напярэдадні навагодніх святаў удзельнікі клуба “Крыніца” разам з чытачамі бібліятэкі арганізавалі бібліявечарыну **“Навагоднія цуды сваімі рукамі”**, у час якой даведаліся аб карнавальных касцюмах і пра тое, як іх можна зрабіць. Наведвальнікі бібліятэкі ўдзельнічалі ў майстар- класе па вырабу яркіх карнавальных масак, абудзілі ў сабе творчы густ і стварылі сімпатычныя маскі. Кожны выбраў сабе адпаведны вобраз для карнавальнага вечара.

Гарадзецкая ПБ, 26 чал.

**24 снежня**

У рамках падрыхтоўкі да навагодніх свят у Дзівінскім філіяле адбылася сустрэча з кіраўніком кружка творчасці Кобрынскага раённага ТЦСОН Надзеяй Камяніскай. Удзельнікі гадзіны творчасці **“Цуды пад Новы год”** пазналі, як рабіць арыгінальныя ўпрыгожванні на елку сваімі рукамі, паўдзельнічалі ў майстар-класе па вырабу ёлачных шароў з тканіны, расказалі пра свае сямейныя традыцыі ўпрыгожвання хаты на навагоднія святы. Вырашылі арганізаваць ў бібліятэцы выставу арыгінальных навагодніх цацак "З бабулінага куфэрка".

Выканаўца Галавейка Т. А.
Тэл. 2 36 81